

Усё аб ільготах для шматдзетных

СТАР. 3



Навошта рукі, калі ёсць грошы?

СТАР. 4



«Белыя Росы» вяртаюцца…

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 КРАСАВІКА 2014 г. СУБОТА № 68 (27678) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

# СЕНАТАРЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА «БОЛЬШ ПРАЗРЫСТЫ» ВОДНЫ КОДЭКС

**На другім пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі пятага склікання сенатары разгледзелі больш за дзесяць пытанняў. Адно з іх датычылася новых прынцыпаў аховы і выкарыстання водных рэсурсаў у Беларусі, змен у дзяржаўным рэгуляванні водакарыстання і паляпшэння экалагічнага стану паверхневых вадаёмаў.**

## БАСЕЙНАВАЕ КІРАВАННЕ

— У праекце Воднага кодэкса прадугледжваецца басейнавы прынцып кіравання воднымі рэсурсамі, у адпаведнасці з якім асноўнымі адзінкамі кіравання выступаюць тэрыторыі рачных басейнаў, — пракаментаваў журналістам канцэптуальныя змены ў прававым рэгуляванні адносін у галіне выкарыстання і аховы вод **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральны дырэктар сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко» Мікалай МАРТЫНАЎ**. — Будуць стварацца басейнавыя саветы такіх рэк, як Днепр, Заходняя Дзвіна, Заходні Буг, Нёман, Прыпяць. Рашэнні прыродаахоўнага міністэрства будуць зацвярджацца і ўзгадняцца з тымі аблвыканкамамі або Мінскім гарвыканкамам, на тэрыторыі якіх гэтыя рэкі працякаюць. Самае галоўнае тут — удзел грамадскасці, прадстаўнікі якой увойдуць у басейнавыя саветы, што дазволіць прымаць больш аб'ектыўныя рашэнні.

Праектам прадугледжаны таксама «больш празрыстыя» патрабаванні да ўзвядзення і ліквідацыі выкапаных сажалак на тэрыторыі зямельных участкаў. «Можна будзе зрабіць гэта без дадатковых узгадненняў, прытрымліваючыся пэўных абмежаванняў, мэта якіх — папярэдзіць ушчамленне правоў і інтарэсаў іншых землекарыстальнікаў», — заўважыў сенатар.

Дзеючае заканадаўства прадугледжвае знос усіх пабудаваных без адпаведных праектаў жывёлагадоўчых ферм паблізу азёр. Згодна з тэкстам новага кодэкса, гэтыя фермы могуць існаваць, але яны павінны быць рэканструяваныя такім чынам, каб забруджаная вада з іх тэрыторыі не трапляла ў грунт, а потым — у вадаёмы.

Яшчэ адно важнае змяненне — змяншэнне памераў водаахоўных зон на тэрыторыі вялікіх рэк да 600 метраў, на тэрыторыі малых — да 50 метраў. «Гэта дазволіць пашырыць будаўніцтва паблізу вадаёмаў, — лічыць Мікалай Мартынаў. — Норма тычыцца і будаўніцтва аўтазаправачных станцый уздоўж дарог, безумоўна, з захаваннем абавязку па экалагічнасці такіх аб'ектаў. Апроч іншага, новы кодэкс ліквідуе ўмовы для чыноўніцкай валакіты ў адносінах атрымання дазволу на водакарыстанне».

Разам са спрашчэннем пэўных нормаў, праект Воднага кодэкса прадугледжвае і больш строгія меры ў справе абароны водных рэсурсаў. Напрыклад, прапануецца катэгарычная забарона выгрузкі снегу, перамешанага з салявымі растворамі, на берагі рэк і азёр.

## ВЫШЭЙ — МОЖНА

Савет Рэспублікі таксама адобрыў папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях мінімальнай заработнай платы. Новая рэдакцыя закона прадугледжвае ўстанаўленне і парадак павышэння мінімальнай заработнай платы, вызначае сферу яе прымянення, адказнасць за парушэнне заканадаўства аб устанаўленні і парадку павышэння мінімальнай зарплаты.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА,** прадстаўляючы дакумент сенатарам, адзначыла, што асноўная навацыя заключаецца ў тым, што ўпершыню ўрад будзе ўстанаўліваць толькі памер месячнай мінімальнай зарплаты. Памер пагадзіннай «мінімалкі» трэба будзе вызначаць разліковым шляхам для розных катэгорый работнікаў, зыходзячы з памеру мінімальнай месячнай заработнай платы. «Гэта звязана з тым, што ўзнікаюць пытанні, як аплачваць працу інвалідаў, як аплачваць работу пры скарочаным працоўным дні і пры асаблівых умовах працы. У законапраекце даецца дакладны алгарытм, як разлічыць пагадзінную мінімальную заработную плату для канкрэтных работнікаў», — растлумачыла яна.

Акрамя таго, паводле слоў Марыяны Шчоткінай, у законапраекце даецца дакладнае азначэнне мінімальнай зарплаты, устанаўліваецца, што гэта — найніжэйшая мяжа, якую гарантуе наймальнік пры аплаце працы ў пэўных умовах. «Гэта значыць, вышэй можна, а ніжэй — нельга. З дапамогай калектыўных дагавораў і пагадненняў могуць быць устаноўлены больш высокія ўзроўні мінімальнай заработнай платы», — сказала кіраўнік ведамства.

СТАР. 2

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ДУХОЎНАСЦЬ

## Рашэнне аб адраджэнні вытворчасці слуцкіх паясоў было правільным, лічыць Аляксандр Лукашэнка





Фота БЕЛТА.

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў прадпрыемства «Слуцкія паясы». Прэзідэнт азнаёміўся з тэхналагічным працэсам вытворчасці аналага слуцкага пояса і сувенірнай прадукцыі на прадпрыемстве, з тэхналогіяй самабытнага народнага ткацтва, паведамляе БЕЛТА. Як было далажана кіраўніку дзяржавы, уся выпушчаная тут прадукцыя сёння запатрабавана. У планах прадпрыемства — пашырэнне асартыменту, выпуск прадукцыі для царквы.**

«У мяне амаль камень з душы зняты. Мяне пераканалі, што мы правільна зрабілі, адрадзіўшы гэты прадмет таго часу. Хоць усё і нятанна, але гэта таго каштавала, таму што застанецца ў гісторыі, на стагоддзі», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўніку дзяржавы ўручылі першы слуцкі пояс, зроблены на прадпрыемстве. Ён з'яўляецца поўнай копіяй арыгінальнага гістарычнага пояса. У якасці сыравіны пры вырабе гэтага аналага выкарыстоўваліся пазалочаныя ніткі і ніткі з натуральнага шоўку. Копія слуцкага пояса мае даўжыню 350 см, шырыню 33,5 см і вагу 500 г. Падарунак кіраўніку дзяржавы ўручылі работніцы, якія выткалі гэты пояс. Учора ж ён быў дастаўлены на захоўванне ў Палац Незалежнасці.

Звяртаючыся да ткачых, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў іх нялёгкая праца. «Заробак, напэўна, не той, які вы павінны атрымліваць, таму што гэта цяжкая праца, — сказаў Прэзідэнт. — Думаю, да канца наступнага года вы пра яго не будзеце гаварыць. Трэба паціху выходзіць на экспарт, па паўцэнта павышаючы цану, і тады прыйдзеце да сусветных цэн. Дзяржава ўклала вялікія грошы, прычым не ў лепшыя часы. Прадукцыя, якую вы робіце, павінна знаходзіць попыт. Шукайце, прапануйце — трэба мабілізавацца і, можа быць, больш прадаваць таго, што запатрабавана».

Размаўляючы з работнікамі прадпрыемства «Слуцкія паясы», Прэзідэнт закрануў не толькі вытворчыя тэмы. У прыватнасці, гаворачы аб сітуацыі ў суседняй Украіне, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што мы гатовы прыняць украінцаў у сябе ў краіне, калі прыйдзецца, але лепш, каб у іх было ціха і спакойна. А самі жыхары Беларусі, каб не дапусціць сітуацыі, падобнай на тую, якая здарылася ў суседзяў, «павінны спакойна і ціха працаваць, зарабляць для сябе».

У гутарцы з жыхарамі Слуцка, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў краіне вырашаецца пытанне паступовага павелічэння заработнай платы работнікаў сфер адукацыі і аховы здароўя. «Усё залежыць ад вас. Трэба зарабіць дадатковую капейку. Яна патрапіць у бюджэт, і мы ад бюджэту падтрымаем вас», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

***«Зніжэнне Нацбанкам стаўкі рэфінансавання на 1% выклікана аб'ектыўнымі прычынамі. Сёння ёсць магчымасць пры захаванні жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі стаўку рэфінансавання знізіць. Існуюць пэўныя патрэбы ў крэдытаванні эканомікі. Безумоўна, стаўкі ў беларускім рублі не тое што жорсткія, але дзесьці загараджальныя. Зыходзячы з таго, што ўзровень інфляцыі ідзе на зніжэнне, магчымасці для зніжэння стаўкі рэфінансавання на адзін працэнтны пункт дастаткова аб'ектыўныя. Немалаважнае значэнне мае і пэўная стабілізацыя на грашовым рынку Беларусі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9920,00 | ■ |
| Еўра | 13790,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 732,10 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +13° |
| Віцебск | +9° |
| Гомель | +10° |
| Гродна | +11° |
| Магілёў | +11° |
| Мінск | +10° |

■ На слыху



Галіна ЖУКАВА з сынам Сяржам.

# «ХАЧУ, КАБ ДЗЕЦІ БЫЛІ СА МНОЙ»

**Пра шматдзетную сям'ю Галіны Жукавай з вёскі Стрыгава Кобрынскага раёна ўся краіна даведалася пасля таго, як знаёмая ўкрала яе 9-гадовую дачку Ксенію і вывезла немаведама для чаго ў Расію.**

Дзяўчынка, на шчасце, праз тыдзень знайшлася. Але з'явілася інфармацыя, што ў Галіны забіраюць пяцярых малодшых дзяцей. Інтэрнэт літаральна ўзарваўся гнеўнымі каментарамі на адрас чыноўнікаў, якія разлучаюць маці з дзецьмі. Каб высветліць, як выглядае сітуацыя на самой справе, карэспандэнт газеты накіравалася ў Стрыгава.

Дом Галіны Жукавай зусім не маленькі, месца тут хапае для ўсёй вялікай сям'і. Але ж і праблем у гэтай хаце таксама хапае. Вось кароткі аповед 35-гадовай маці семярых дзяцей пра жыццё:

— Нарадзілася і вырасла ў вёсцы Хмелева Жабінкаўскага раёна. У 16 гадоў паехала да цёткі ў Віцебскую вобласць, пазнаёмілася з 23-гадовым хлопцам, думала, гэта лёс. Цяпер старэйшай дачцэ Каці сямнаццаць з паловай гадоў. Пасля Каці праз год нарадзіўся Андрэй. Але жыцця з мужам не атрымалася. Ён амаль не працаваў, піў, пачаў руку на мяне паднімаць. Па тэлефоне прасілася ў маці вярнуцца дадому. Праз нейкі час прыехалі маці з сястрой ды забралі мяне з дзецьмі і чамаданам рэчаў.

Працавала ў калгасе цялятніцай, ніякай работы не цуралася, кармы і ваду на сабе насіла. Сустрэўся чалавек, які прапанаваў жыць разам. На той час ён быў загадчыкам фермы. Падумала: станоўчы мужчына, нарэшце будзе сапраўдная сям'я. Сышліся, сталі нараджацца дзеці. Шукалі са сваім грамадзянскім мужам месца, дзе дадуць добрае жыллё. Перамянілі некалькі месцаў жыхарства. Дом далі ў вёсцы Песцянькі Кобрынскага раёна. Але грамадзянскі муж не спяшаўся ўзаконьваць адносіны. Ніводнага з дзяцей ён на сябе не запісаў. Работу кінуў. Біў — цярпела, аж пакуль не стала крывёю кашляць. Давялося расстацца.

На пераезд у Стрыгава меліся дзве прычыны. Той калгасны домік пачаў разбурацца, а на рамонт не было ні сіл, ні сродкаў. І галоўнае, што тут аграгарадок, школа, садок побач, не трэба дзецям мерзнуць на прыпынку ў чаканні аўтобуса. У вёсцы ёсць музычная школа, Ксенія займаецца музыкай. Таму я ўзяла крэдыт на пакупку дома, з якога 200 мільёнаў рублёў пагасіла дзяржава як дапамогу шматдзетнай сям'і. Сем мільёнаў трэба выплаціць самой па дамоўленасці з былымі гаспадарамі.

СТАР. 3

■ Курсавая розніца

# У ЧАКАННІ ЗНІЖЭННЯ

**Паветраны шарык нельга надзімаць занадта моцна, бо ў пэўны момант ён можа лопнуць. Гэтая простая, з дзяцінства засвоеная ісціна выдатна ілюструе сітуацыю з ненатуральна высокім коштам еўра.**

Вельмі дзіўна, што дагэтуль Еўрапейскі Цэнтрабанк не прымае нейкіх канкрэтных захадаў па зніжэнні курсу сваёй валюты. Чаго яны чакаюць — незразумела. Але агульнавядома, што завышаны курс не прыводзіць ні да чаго добрага. А на міжбанкаўскім рынку ўвогуле занадта высокі кошт з'яўляецца своеасаблівым сігналам да таго, што хутка можа адбыцца рэзкае зніжэнне, а значыць, пэўную валюту трэба «скідваць», каб не прагарэць. Нездарма графікі, якія адлюстроўваюць дынаміку курсу той ці іншай грашовай адзінкі, як правіла, вельмі «нервовыя» і складаюцца з плаўных перыядаў росту і рэзкіх абвалаў. Апошнім часам аналітыкі прадракаюць еўра значнае зніжэнне ўжо да сярэдзіны года. І мне здаецца, што яны маюць рацыю.

Беларускі рубель зноў патаннеў. За гэты тыдзень долар адносна нашай валюты падаражэў на 20 рублёў (плюс 0,2%) да 9920. А еўра падняўся ажно на 230 рублёў (плюс 1,7%) да 13790. Адступіў назад толькі расійскі рубель — на 0,5 грашовай адзінкі (мінус 0,2%) да 278,5. Дарэчы, «расіянін» за апошнія дні здаў пазіцыі і адносна еўра з доларам. На гэта паўплывалі хваляванні ва ўсходняй Украіне.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**




## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ НЕ ВЫДАСЦЬ ЯНУКОВІЧА

Генпракуратура Расіі не бачыць падстаў для экстрадыцыі Віктара Януковіча ва Украіну. Пра гэта заявіў у пятніцу, 11 красавіка, генеральны пракурор РФ Юрый Чайка ў Сімферопалі. «...Па нашых даных, ён не здзейсніў ніякіх злачынстваў», — сказаў Чайка, дадаўшы, што Масква па-ранейшаму лічыць Януковіча легітымным прэзідэнтам».

### «АЛЬФА» АДМОВІЛАСЯ ІСЦІ НА ШТУРМ У ДАНЕЦКУ І ЛУГАНСКУ

Кіраўніцтва ўкраінскага спецпадраздзялення «Альфа» адмовілася штурмаваць захопленыя па-прарасійску настроенымі актывістамі будынкі ў Данецку і Луганску. Афіцэры адкрыта заявілі пра гэта на нарадзе сілавікоў з удзелам першага віцэ-прэм'ера Віталя Ярэмы ў Данецку і ў прысутнасці сакратара СНБА Украіны Андрэя Парубія ў Луганску, перадае From-UA. «Мы не пойдзем мачыць усіх запар у занятых будынках Луганска і Данецка. Мы будзем працаваць выключна ў рамках закона. Нашы падраздзяленні створаны для вызвалення заложнікаў і барацьбы з тэрарызмам», — заявілі спецназаўцы.



### ФРАНЦУЗСКІМ ПРАЦАДАЎЦАМ ЗАБАРОНЕНА ТУРБАВАЦЬ ПАДНАЧАЛЕНЫХ ПАСЛЯ 18.00

Прафсаюзы і арганізацыі працадаўцаў Францыі заключылі пагадненне, якое забараняе працадаўцам турбаваць сваіх падначаленых пасля заканчэння працоўнага дня, перадаюць інфармагенцтвы. Цяпер работнікі кампаній могуць не адказваць на дзелавыя тэлефонныя званкі або электронныя паведамленні да 9.00 і пасля 18.00.

### МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ ЧОРНЫХ СКРЫНЬ МАЛАЙЗІЙСКАГА «БОІНГА» ВЫЗНАЧАНА

Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Аўстраліі Тоні Эбат. Паводле яго слоў, выратавальнікі ўпэўнены, што ведаюць месцазнаходжанне чорных скрынь з дакладнасцю да некалькіх кіламетраў. Аднак ён адзначыў, што пакуль наперадзе шмат цяжкасцяў: перш чым зразумець, што адбылося падчас палёту «Боінга», прыйдзецца спачатку падняць яго самапісцы з марскога дна, з глыбіні каля чатырох з паловай тысяч метраў. Між тым, чорныя скрыні ў хуткім часе могуць спыніць сігналы.

ISSN 1990 - 763X

14068

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ХОЧАЦЕ ДОЎГА ЖЫЦЬ? ДАРУЙЦЕ САБЕ

**Лічыцца, што здольнасць чалавека спраўляцца са стрэсам уплывае на стан здароўя. Цяпер жа спецыялісты раяць не проста выкарыстоўваць методыкі расслаблення для павелічэння працягласці жыцця.**

На іх думку, нельга быць да сябе занадта патрабавальным, піша The Telegraph. Неабходна прыняць пазіцыю «самаспачування». Калі чалавек не вінаваціць сябе за тое, што перажывае з нагоды стрэсавых момантаў, што не можа сябе ўзяць у рукі, ён толькі выйграе ад гэтага. Жыццё стане лягчэйшым і больш шчаслівейшым. Людзі, не здольныя да самаспачування, падвяргаюцца большаму стрэсу. Яны чапляюцца за перажыванні, што павышае рызыку ўзнікнення хвароб (у тым ліку анкалагічных, сардэчна-сасудзістых, а таксама хваробы Альцгеймера).

■ Агульная справа

# ЦЭНТР, ЗДОЛЬНЫ ВЫРАТАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ

**Сродкі, заробленыя на рэспубліканскім суботніку, які праводзіцца сёння, пойдуць на стварэнне цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава. Такое рашэнне прыняла рабочая група па падрыхтоўцы суботніка пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля ТОЗІКА.**

«Рэалізацыя дарагога праекта ўжо распачата, — патлумачыў віцэ-прэм'ер. — З бюджэту накіравана больш за 100 млрд рублёў. Трэба яшчэ 460 млрд, і сродкі, заробленыя на суботніку, вельмі дапамогуць».

Дарэчы, пазітронна-эмісійная тамаграфія — самы сучасны і дакладны метад, які дазваляе выяўляць ракавыя пухліны памерам каля 1-2 мм. Ніводнае абсталяванне больш не здольна на гэта. Па словах **намесніка дырэктара РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Сяргея ЧЫРВОНАГА,** выкарыстанне метаду дазваляе вызначыць ступень распаўсюджання пухліннага працэсу, выявіць драбнюткія метастазы, ацаніць эфектыўнасць праведзенага лячэння і самае галоўнае — своечасова выявіць рэцыдыў захворвання. На першым этапе асноўны цэнтр размесціцца на тэрыторыі РНПЦ анкалогіі, дзе будзе тры сканавальныя тамографы. У далейшым магчыма размяшчэнне такіх жа тамографаў у рэгіёнах і сталіцы.

Варта нагадаць, што сёлета Беларусь святкуе 70-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 100-годдзе з пачатку Першай сусветнай вайны. Анатоль Тозік адзначыў, што ў сувязі з гэтым рэспубліканскім органам дзяржкіравання і іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным ураду, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, іншым арганізацыям рэкамендавана на добраахвотнай аснове правесці рэспубліканскі суботнік на працоўных месцах або добраўпарадкаваць і прывесці ў належны стан мемарыяльныя комплексы, помнікі, месцы баявой і вайсковай славы, пахаванні часоў Першай і Другой сусветных войнаў.

**Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ.**

**Міністэрства фінансаў растлумачыла парадак пералічэння грашовых сродкаў, заробленых на рэспубліканскім суботніку 12 красавіка. Адпаведная інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце міністэрства.**

Фізічныя і юрыдычныя асобы пералічваюць грашовыя сродкі на банкаўскія рахункі райвыканкамаў і гарвыканкамаў, нумары якіх варта ўдакладняць на месцах. Потым райвыканкамы і гарвыканкамы накіроўваюць сродкі, якія паступілі, на банкаўскія рахункі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Далей грошы будуць пералічаны на рахунак Міністэрства фінансаў у Нацыянальным банку. Нумар рахунку ў беларускіх рублях: 3640900000105, код банка 153005042, атрымальнік — Міністэрства фінансаў, УНП 100691903.

# Да 1 жніўня павінен быць наведзены парадак на ўсіх прадпрыемствах

Падчас рабочай паездкі ў Слуцк Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў губернатара Мінскай вобласці праблемнымі прадпрыемствамі ў Слуцку. Сямён Шапіра адзначыў, што насцярожвае праца мясцовага мясакамбіната, на якім склалася дрэнная эканамічная сітуацыя і выяўлены страты.

Прэзідэнт прыняў рашэнне з'ездзіць на гэты мясакамбінат, а таксама наведаць ільнокамбінат, што першапачаткова праграмай паездкі ў Слуцк запланавана не было, паведамляе БЕЛТА. Прыбыўшы на льнокамбінат, Аляксандр Лукашэнка абурыўся поўнай безгаспадарчасцю: тэрыторыя прадпрыемства выглядала бруднай і непрыбранай; паўсюль у вялізныя кучы была складзена сыравіна, у адным з памяшканняў звалена тэхніка. «Мы крыўдзімся на сялян, што яны не могуць даць трасты. А як вы яе тут захоўваеце? Куды вы складваеце сыравіну? Як можна так захоўваць лён? Чаму вы ўсё гэта не перапрацоўваеце?» — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

«Заводзьце крымінальныя справы і мне дакладвайце», — даручыў Прэзідэнт старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандру Якабсону. Аляксандр Лукашэнка таксама распарадзіўся з сённяшняга дня накіраваць на прадпрыемства дырэктарам старшыню Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама.

Затым Аляксандр Лукашэнка пераехаў на другое праблемнае прадпрыемства — Слуцкі мясакамбінат. Тут кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на адсутнасць парадку і неналежныя ўмовы, у якіх захоўваецца мяса. «Тут таксама заводзьце крымінальную справу і разбірайцеся па ўсіх пытаннях», — сказаў Прэзідэнт. «У нас недазагружаны магутнасці нармальных мясакамбінатаў. Неадкладна мяса адсюль перакінуць на іншыя мясакамбінаты, забараніць прымаць тут жывёлу, за месяц навесці парадак!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Сямёна Шапіры.

Звяртаючыся да старшыні КДК, Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што да 1 жніўня павінен быць наведзены парадак на ўсіх прадпрыемствах.

# СЕНАТАРЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА «БОЛЬШ ПРАЗРЫСТЫ» ВОДНЫ КОДЭКС

## Кантроль над міграцыяй



Фота БЕЛТА.

Сярод ухваленых Саветам Рэспублікі ратыфікацый міжнародных дагавораў — беларуска-таджыкістанскае пагадненне аб часовай працоўнай дзейнасці грамадзян дзвюх краін на тэрыторыі абедзвюх дзяржаў. Пагадненне было падпісана ў час афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Таджыкістан 28 кастрычніка 2011 года ў Душанбэ.

Дакумент дае магчымасць бакам каардынаваць дзеянні па рэгуляванні асноўных кірункаў супрацоўніцтва ў розных галінах дзейнасці працоўных мігрантаў. Як растлумачыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай МЕЛЬЧАНКА,** прадстаўляючы дакумент сенатарам, у прыватнасці, гэта датычыцца парадку ўезду, працаўладкавання, знаходжання і выезду, пытанняў сацыяльнай абароны, пенсійнага забеспячэння, умоў і аховы працы, аплаты, падаткаабкладання, пералічэння зробленых грошай у дзяржаву пастаяннага пражывання, аказання медыцынскай дапамогі.

Ён удакладніў таксама, што пагадненне прадугледжвае больш строгія нормы ў параўнанні з існуючымі (у прыватнасці, аб абмежаванні пры змене мігрантам працадаўцы).

## Супраць «адмывання» грошай

Беларускія сенатары ўхвалілі таксама законапраект пра ўнясенне змен і дапаўненняў у закон «Пра меры па прадухіленні легалізавання прыбыткаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансаванні тэрарыстычнай дзейнасці». **Першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ** заўважыў, што прыняцце законапраекта абумоўлена інтэграцыйным працэсам у рамках ЕЭП. Нормы, прадугледжаныя ў дакуменце, у заканадаўстве РФ ужо адрэгуляваны.

Палажэннямі законапраекта, у прыватнасці, замацоўваецца права банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый адмовіць удзельнікам фінансавай аперацыі ў яе ажыццяўленні, калі яна адпавядае крытэрыям выяўлення і прыкметам падазроных фінансавых аперацый, а таксама не больш чым на два працоўныя дні прыпыніць ажыццяўленне гэтай фінаперацыі для прыняцця рашэння пра яе ажыццяўленне або пра адмову.

Адказваючы на пытанні сенатараў адносна крытэрыяў, якія з'яўляюцца падставай для адмовы ў фінаперацыі, Тарас Надольны растлумачыў, што цяпер гэтых крытэрыяў больш за 50 і яны носяць рэкамендацыйны характар для банкаў. «Апроч гэтага, зыходзячы з практыкі працы банкаўскай сістэмы, зыходзячы з заканадаўства краін-партнёраў па ЕЭП і міжнароднага досведу, вышэйзгаданая інструкцыя будзе дапоўнена і іншымі крытэрыямі», — распавёў першы намеснік старшыні кіравання Нацбанка, растлумачыўшы пры гэтым, што яны будуць адпрацаваны сумесна з Камітэтам дзяржаўнага кантролю.

Адным з новаўвядзенняў з'яўляецца неабходнасць інфармавання банкамі ўдзельніка фінаперацыі пра яе прыпыненне і адмову ў ажыццяўленні з указаннем матываваных падстаў. Таксама выключаецца адказнасць банкаў за страты і маральную шкоду, якая можа быць нанесена ў выніку прыпынення фінаперацыі ці адмовы ў яе ажыццяўленні.

Усе гэтыя карэкціроўкі закліканы арганізаваць у банках паўнавартасную сістэму ўнутранага кантролю, а таксама мінімізаваць рызыку ўцягвання банкаў у працэс легалізавання злачынных прыбыткаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СВЯТА ПАЭЗІІ І КОСМАСУ



**Да Дня касманаўтыкі Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа сумесна з Музеем горада Мінска арганізавалі выставу «Зорнае неба» вядомага скульптара і народнага мастака Беларусі Івана Міско.**

«Касмічным» скульптарам Івана Якімавіча называюць нездарма: яго заўсёды прыцягваў космас. У калекцыі мастака шмат скульптурных партрэтаў вядомых касманаўтаў, сярод якіх ёсць, безумоўна, і беларусы — Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак. З імі Іван Якімавіч падтрымлівае сяброўскія сувязі. Акрамя таго, зусім нядаўна сваё віншаванне і падзяку з арбіты даслаў і трэці беларускі касманаўт — Алег Навіцкі. Прычым гэты відэазапіс усе наведвальнікі выставы змаглі пабачыць на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця.

Асаблівую падзяку Іван Міско заўсёды выказвае сям'і Гагарыных, якая прадаставіла пуцёўку і магчымасць паехаць у Зорны гарадок. На выставе «Зорнае неба» можна ўбачыць фота, на якіх — мастак са знакамітымі касманаўтамі, а таксама медалі, эскізы і, безумоўна, фотаздымкі работ майстра.

— Музей Коласа для выставы быў абраны невыпадкова: народнага паэта Якуба Коласа заўсёды цікавіла тэма неба. У сваім дзяцінстве Колас, калі яны жылі ў Ластку, часта садзіўся на ганак і глядзеў на неба. Тады ён думаў, якое яно прывабнае і прыгожае, але і не мог нават меркаваць аб тым, што пройдзе час і людзі змогуць паляцець у космас. Калі б народны паэт жыў у наш час, космас абавязкова быў бы апеты ў яго творчасці, — кажа дырэктар музея Я. Коласа Зінаіда Камароўская. — Выстава «Зорнае неба» паказвае, наколькі пранікся тэмай космасу Іван Якімавіч. Таму нам удвая прыемна, што выстава Івана Міско праходзіць менавіта ў нас.

**Надзея БУЖАН, фота аўтара**



■ Наш дом — ваш дом

# АЛІМП СКАРЫЎСЯ

У Мінску ўчора адкрыўся атэль «Вікторыя-Алімп»

**А увогуле за апошнія два тыдні свае дзверы для гасцей адчынілі 8 гасцініц.**

«Вырашана мэтавая задача — сталіца забяспечана месцамі ў гасцініцах», — заявіў **прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** на адкрыцці гасцінічнага комплексу. Кіраўнік урада акцэнтаваў увагу на тым, што за год гасцінічны фонд Мінска павялічыўся ў два разы — да 10 тысяч месцаў.

У гасцінічным комплексе будуць пражываць кіраўнікі Міжнароднай федэрацыі хакея, тут пройдуць мерапрыемствы хакейнага кангрэса, паведамляе **БЕЛТА**. Кіраўнік беларускага ўрада выказаў упэўненасць, што ў Год гасціннасці персанал атэля справіцца з тым, каб годна прыняць гасцей, стварыць для іх самыя камфортныя ўмовы. Прэм'ер падкрэсліў, што аб'ект быў вельмі складаным: прыйшлося змяняць заказчыка (расійскі інвестар аказаўся не ў стане выканаць узятыя на сябе абавязацельствы), адбылася і замена падрадчыка (задача была ўскладзена на будаўнічы трэст №3 г. Салігорска, калектыў пацвердзіў сваё званне ардэнаноснага прадпрыемства). Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, будаўнікі з Мінска і рэгіёнаў рэспублікі, задзейнічаныя на аб'екце, прадэманстравалі сваё прафесійнае майстэрства.

Такую ж ацэнку будаўнікам даў **старшыня Мінгарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА:** «У сціслыя тэрміны быў пабудаваны аб'ект сусветнага ўзроўню, — заявіў мэр сталіцы. — Назапашаны тут практычны вопыт дазволіць беларускім будаўнікам узводзіць аб'екты і ў іншых краінах». Паводле інфармацыі ўпраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама, нумарны фонд сучаснага чатырохзоркавага гасцінічнага комплексу «Вікторыя-Алімп» складае 234 гасцінічныя нумары.

# ПРЫЕМНЫЯ БОНУСЫ Ў АДНОЙ КАРТЦЫ

**Аператар нацыянальнай сістэмы збору платы за праезд BelToll ініцыяваў да чэмпіянату свету па хакеі выпуск брэндаваных картак лаяльнасці «AUTOHELP» спецыяльна для замежных гасцей Беларусі.**




Цяпер любы замежнік, які падае заяву на атрыманне беларускай візы, незалежна ад мэты візіту, разам з дазволам на ўезд будзе атрымліваць «Картку госця Рэспублікі Беларусь» з сімволікай і кантактамі сістэмы BelToll. Тым самым плануецца павялічыць інфармаванасць замежных грамадзян аб сістэме платных дарог Беларусі. Тыраж такой спецыяльнай карткі з брэндам BelToll складае 15 тысяч штук і пры неабходнасці будзе павялічаны.

## Аматарам хакея — «зялёны калідор»

**Прадстаўнік кампаніі-аператара сістэмы BelToll Сяргей БУРЫ** таксама адзначыў, што на час правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску (з 25 красавіка па 31 мая) цяпер вызваляюцца ад платы за праезд па платных аўтамабільных дарогах і замежныя аўтамабілісты. Тут маюцца на ўвазе транспартныя сродкі (з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 тоны), зарэгістраваныя на тэрыторыі дзяржаў, якія не ўваходзяць у Мытны саюз. Гэта прадугледжана адпаведным Указам кіраўніка дзяржавы №154 ад 10 красавіка.

На вызначаны перыяд карыстанне платнымі аўтамабільнымі дарогамі замежнікамі будзе ажыццяўляцца без заключэння дагавора на іх выкарыстанне і рэгістрацыі ў сістэме электроннага збору платы — гэтак жа, як цяпер вышэйзгаданымі дарогамі карыстаюцца грамадзяне краін, якія ўваходзяць у Мытны саюз.

Разам з тым, «Картка госця» дае магчымасць атрымліваць пэўныя зніжкі на розныя тавары і паслугі. Напрыклад, там прадугледжаны розныя бонусы пры куплі паліва і абслугоўвання ў службах аўтасэрвісу.

## Ключ ад усіх дзвярэй...

У Беларусі праграма лаяльнасці ў сістэме «AUTOHELP» працуе з 2008 года. За пяць гадоў больш за 3 млн чалавек сталі ўладальнікамі «Карткі госця горада Мінска» і «Карткі госця Рэспублікі Беларусь». Спецыяльна да сёлетняга планетарнага першынства па хакеі выпускаецца «Карта госця чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2014 года», якая будзе распаўсюджвацца пры ўездзе ў краіну, праз МУС, замежныя ўстановы, а таксама разам з пакетамі балельшчыка, у турфірмах і гасцініцах. Гэтая картка дае права зніжак па шырокім спектры паслуг, пачынаючы ад пакупкі паліва для аўтамабіля да наведвання санаторыяў і дамоў адпачынку. У залежнасці ад прадстаўніка тавараў і паслуг зніжкі будуць вар'іравацца ад 2% да 100%. Так, у кавярнях і рэстаранах можна будзе разлічваць на зніжку ў 10-15%. У прадуктовых крамах і вялікіх універсамах — 3-5%. А зніжка на забаўляльныя мерапрыемствы і ўвогуле можа скласці ад 50% да 100%. Гэта, напрыклад, датычыцца некаторых музеяў. Разам з тым, картка будзе выконваць функцыю праязнога.

Асобна выпусцяць партыю картак, якія адначасова будуць выкарыстоўвацца як ключ ад гасцінічных нумароў. Пасля ад'езду замежнага госця гасцінічны ключ, які, зразумела, кадзіруецца на пэўны тэрмін, можа стаць выдатным сувенірам (магніцік на халадзільнік) з сімволікай чэмпіянату. Аднак, як і астатнія карткі, яна будзе дзейнічаць на працягу 2,5 года. Атрымліваецца, што і ў наступныя візіты ў Беларусь турыст зможа разлічваць на тыя ж самыя зніжкі. Дарэчы, у адной упакоўцы з карткай госць таксама атрымае папяровы буклет з правіламі карыстання дысконтам, пералікам зніжак і 2,5 тыс. пунктаў прыёму. Гэтую ж інфармацыю можна будзе атрымаць пры дапамозе QR-кода, нанесенага на картку. Для гэтага дастаткова будзе скарыстацца мабільнымі прыладамі сувязі.

Як адзначыў **Юрый ЦВІРКО, дырэктар «Мобіл Аўта Хэлп Компані»** — прадпрыемства, адказнага за выпуск картак, у падобным выпадку карты лаяльнасці выконваюць адразу некалькі функцый: «Гэта, безумоўна, іміджавы інструмент. Акрамя таго, прывабны дызайн карткі робіць яе арыгінальным сувенірам. А разам з багатым інфармацыйным напаўненнем усё гэта пераўтвараецца ў сапраўдны навігатар па славутасцях горада».

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## Змены ў раскладзе

**У сувязі з рамонтам чыгуначнага моста на перагоне Рудзенск — Пухавічы 15 і 16 красавіка часткова змяняецца расклад руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа.**

Шэраг цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа адпраўленнем са станцыі «Мінск-Пасажырскі», прыпыначнага пункта «Інстытут культуры» будуць следаваць да станцыі «Рудзенск» і назад, адпраўленнем са станцыі «Жлобін», «Бабруйск», «Асіповічы» да станцыі «Пухавічы» і назад. Перавозка пасажыраў паміж станцыямі «Рудзенск» і «Пухавічы» будзе весціся аўтобусамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## КАБ ПАСПЕЦЬ НА СУБОТНІК

**У сувязі з правядзеннем рэспубліканскага суботніка рух цягнікоў Мінскага метрапалітэна ў першую змену будзе арганізаваны па графіках будных дзён.**

Гэтак жа, як па будных днях, будуць курсіраваць 30 аўтобусных, 5 тралейбусных і трамвайны маршрут №3, паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс». Па графіку працоўнай суботы будзе арганізавана праца яшчэ 6 аўтобусных, 3 тралейбусных і трамвайнага маршрута №11. На шэрагу аўтобусных і тралейбусных маршрутах будзе павялічана колькасць рухомага саставу. На 9 прыгарадных аўтобусных маршрутах адпраўленнем з Мінска раніцай прадугледжаны дадатковыя рэйсы.

## ВА УКРАІНУ БІЛЕТАЎ ПАКУЛЬ ШТО НЯМА

**З 27 мая часова прыпыняецца продаж праязных дакументаў на цягнікі фарміравання Беларускай чыгункі, якія курсіруюць ва ўкраінскім напрамку, паведаміла прэс-служба магістралі.**

Гэта абумоўлена, як гаворыцца ў паведамленні Дзяржаўнай адміністрацыі чыгуначнага транспарту Украіны, неабходнасцю правядзення карэкціроўкі раскладу руху міжнародных цягнікоў, увядзеннем дадатковых прыпынкаў у зносінах з Крымскай дырэкцыяй.

Сёння Беларуская чыгунка ўзаемадзейнічае з чыгуначнымі адміністрацыямі па ўзгадненні раскладу руху міжнародных цягнікоў. Пра аднаўленне продажу праязных дакументаў на тыя з іх, што ідуць па тэрыторыі Украіны, будзе паведамлена дадаткова.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПРАВАСЛАЎНАЯ ЛІТАРАТУРА — НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Выстава «Духоўная кніга» адкрыецца 14 красавіка на філалагічным факультэце БДУ. Прысвечана яна галоўнаму хрысціянскаму святу — Вялікадню.**

Увазе наведвальнікаў будуць прапанаваны розныя выданні Бібліі, кнігі пра беларускіх святых і асноўныя хрысціянскія таінствы, а таксама розная праваслаўная літаратура на беларускай мове. Тут жа будуць прадстаўлены і выданні пра сямейнае жыццё і праваслаўнае выхаванне дзяцей.

Гасцей чакае сустрэча з членам Беларускай біблейскай камісіі, загадчыкам кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ Іванам Чаротам. Камісія была створана ў 1989 годзе для перакладу ўсёй Бібліі на беларускую мову, якая выкарыстоўвалася б падчас богаслужэння. Акрамя таго, перад перакладчыкамі ставілася задача выпрацаваць такі варыянт царкоўна-беларускай мовы, які б захаваў традыцыі старажытнаславянскага пісьменства і адпавядаў нормам нацыянальнай мовы. Іван Чарота раскажа пра складанасці работы з богаслужэбнымі тэкстамі, пра дасягнутыя вынікі і бліжэйшыя перспектывы.

У перыяд работы выставы, якая прадоўжыцца да 20 красавіка, усе ахвотныя змогуць таксама пабачыць абразы Багародзіцы, якія найбольш часта прадстаўлены ў беларускіх храмах. Абразы з'яўляюцца экспанатамі фонду музея беларускай народнай культуры БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## МАСЛА З «ПРЫМЕССЮ»

**У чыгуначным кантэйнеры са змазачнымі масламі спрабавалі незаконна правезці схаваныя запчасткі і электраінструмент коштам больш як 124 мільёны рублёў.**

Груз вагой болей за 26 тон быў адпраўлены кампаніяй, зарэгістраванай у Літоўскай Рэспубліцы. Атрымальнікам тавару з'яўлялася фірма, што знаходзіцца ў Казахстане.

Падчас мытнага кантролю ў пункце мытнага афармлення «Маладзечна» «дадатковы» груз, пра які ў суправаджальных дакументах, зразумела, не было ніякай пазнакі, быў знойдзены. Па інфармацыі аддзела ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні, у паддонах, абцягнутых непразрыстым поліэтыленам, былі схаваны аўтамабільныя запчасткі, электраінструмент, часткі для станкоў. Усяго 55 пазіцый. Тавар быў канфіскаваны.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ДВАЙНІКІ BMW

**Серабрысты BMW 735I 2001 года выпуску, коштам больш як Br200 млн, канфіскаваны супрацоўнікамі аператыўна-пошукавага аддзела гомельскай мытні.**

Яго ўладальнік, гамяльчанін, расказаў, што набыў машыну ў расійскім горадзе Клінцы ў лістападзе. Тым часам высветлілася, што машына той жа маркі, з тымі ж рэгістрацыйнымі данымі ездзіць сёння і па Маскве. Але на рэгістрацыйным уліку ў сталіцы Расіі знаходзіцца аўтамабіль BMW 735I 2003 года выпуску чорнага колеру — з дзяржаўным рэгістрацыйным знакам і пасведчаннем пра рэгістрацыю транспартнага сродку, ідэнтычнымі гомельскаму аўто. Пры гэтым у аўтамабіляў розныя VIN-нумары. Гомельскі BMW канфіскаваны, пачаты адміністрацыйны працэс. У прэс-службе гомельскай мытні расказалі, што «двайніка» вылічылі з-за адсутнасці мытнага афармлення аўтамабіля.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## ОАО «Минсктелекомстрой»

Учетный номер плательщика: 100068131. Вид экономической деятельности: строительство гражданских инженерных сооружений
Организационно-правовая форма: Акционерное общество. Орган управления: Собрание акционеров
Единица измерения: млн руб. Адрес: 220037, г. Минск, ул. Аннаева, дом 49, пом. 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2014 года

| АКТИВЫ | Код строки | 31 декабря 2013 года | 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 24 042 | 15 917 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 | 3 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **24 044** | **15 920** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 9 046 | 8 520 |
| в том числе: материалы | 211 | 7 366 | 6 025 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 1 680 | 2 495 |
| готовая продукция и товары | 214 | | |
| товары отгруженные | 215 | | |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 397 | 300 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 3 | 24 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 13 155 | 5 519 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 929 | 9 122 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 9 | 9 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **30 539** | **23 494** |
| **БАЛАНС** | **300** | **54 583** | **39 414** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 14 301 | 372 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 639 | 514 |
| Добавочный капитал | 450 | 6 414 | 15 921 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 26 703 | 17 602 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **48 057** | **34 409** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **31 декабря 2013 года** | **31 декабря 2012 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | 103 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **103** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 6 526 | 4 897 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 216 | 99 |
| по авансам полученным | 632 | 838 | 46 |
| по налогам и сборам | 633 | 2 167 | 2 161 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 635 | 532 |
| по оплате труда | 635 | 1 916 | 1 491 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 591 | 457 |
| прочим кредиторам | 638 | 163 | 111 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | 5 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ V** | **690** | **6 526** | **4 902** |
| **БАЛАНС** | **700** | **54 583** | **39 414** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь—декабрь 2013 года | За январь—декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 94 706 | 71 682 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 64 757 | 48 563 |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | 29 949 | 23 119 |
| Управленческие расходы | 040 | 9 580 | 6 169 |
| Расходы на реализацию | 050 | 0 | 0 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050) | 060 | 20 369 | 16 950 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 2 080 | 643 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 7 506 | 5 947 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+- 060 + 070 - 080) | 090 | 14 943 | 11 646 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 457 | 1 336 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 37 | 69 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 1 420 | 1 226 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | 41 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | 0 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 58 | 24 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 58 | 24 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 59 | 181 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | - | 8 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 37 | 8 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 22 | 165 |
| Иные доходы и расходы | 140 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 - 110 + 120 | 150 | 1 456 | 1 179 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090 +- 150) | 160 | 16 399 | 12 825 |
| Налог на прибыль | 170 | 3 768 | 3 104 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (+- 160 - 170 +- 180 +- 190 - 200) | 210 | 12 631 | 9 721 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 2 958 | 2 150 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (+- 210 +- 220 +- 230) | 240 | 15 589 | 11 871 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0,01319 | 0,01018 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | 0,01319 | 0,01018 |

Руководитель Л.И. Адамович

Главный бухгалтер Н.И. Бондарович



ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**

**24 апреля 2014 года проводит 5-ый повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности на 7-ом аукционе**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 56 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 133093 дв. 747907 1989 г. 3 кат. 110816 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 57 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO095764 дв. 242788 1988 г. 3 кат. 117736 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 59 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 133001 дв. 505832 1989 г. 3 кат. 106313 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 60 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 153899 дв. 642710 1990 г. 3 кат. 94065 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 61 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 132482 дв. 499891 1989 г. 3 кат. 87168 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 65 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 160738 дв. 694403 1990 г. 3 кат. 93545 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 71 | Автошасси Урал-375АМ ш. 429679 дв. 261413 1984 г. 4 кат. 1575 км | г. Крупки, в/ч 63755 (филиал) | 30 000 000 | 3 000 000 |

**Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 15.03.14 № 48.**
**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

УНП 101099370

# «ХАЧУ, КАБ ДЗЕЦІ БЫЛІ СА МНОЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галіна расказвае, што сустрэлі шматдзетную сям'ю ў Стрыгаве добра. Кіраўнік мясцовай гаспадаркі адразу ж прадаў карову ў крэдыт. Праз тыдзень пасля пераезду дзеці былі з малаком. Сама яна ўладкавалася працаваць на ферму даяркай. Але работа была цяжкай, фактычна ўвесь дзень занятая, а зарплата невысокая. Паводле яе слоў, вылічаць за соткі, за карову — і атрымліваць няма чаго. Таму з сельгаспрадпрыемства звольнілася, пайшла працаваць у Брэст на «Санта-Брэмар». Зарплата — чатыры мільёны. Адзіная нязручнасць, што далёка. На ранішнюю змену трэба выходзіць з дому каля 4-х раніцы, ісці пехатою дзве гадзіны да Кобрына, а там аўтобус прадпрыемства вязе ў Брэст. Выйдзеш з дому ў чатыры, а вернешся а палове адзінаццатай вечара. Але графік зручны: дзень працуеш — суткі дома, ноч працуеш — двое сутак дома, усё можна зрабіць. Дзеці ў гэты час, вядома, заставаліся «як давядзецца». Часта малых глядзела суседка-педагог.

— Вось таму, — тлумачыць Галіна, — я і прывеціла былую аднавяскоўку Ірыну Корпан. Думала, можа іншым разам яна і за дзецьмі прыгледзіць. Ірына, калі не п'е, здаецца нармальнай. Я яе нават хлеб пячы навучыла.

І тут жа згадвае, што спецыялісты сацыяльна-педагагічнага цэнтра ёй забаранялі прымаць у доме гэтую жанчыну з вядомай рэпутацыяй. Але ж Галіна яе пашкадавала — той хутка нараджаць...

Пра выкрадальніцу Ксеніі Ірыну Корпан асаблівая размова. Яна па сваёй распуснасці, відаць, пераўзышла многіх падобных да яе кабет. Бацькоўскіх правоў пазбаўлена, пабывала ў турме, але зноў бадзяецца па прытонах, зноў нараджае. Пры тым, што ў жанчыны ёсць багатыя родзічы ў Расіі, якія гатовыя купіць ёй дом, дапамагаць матэрыяльна, калі яна згодзіцца жыць па-чалавечы. А ёй гэта трэба? Ніхто цяпер не можа зразумець, навошта ёй была гэта дзяўчынка ў яе падарожжы. Можа, патлумачыць міліцыі, калі яе ўсё ж затрымаюць.

Галоўнае, чаму радуецца Галіна, — дачка расказала, што яе не крыўдзілі, кармілі ўсе дні. Але ж дзіця перажыло стрэс, спіць вельмі неспакойна, ёй сняцца вялікагрузныя машыны — фуры, якія перакульваюцца і гараць. Яна са сваёй дарослай спадарожніцай ехалі ў асноўным на такіх машынах. «Ксенія — дзіця, для яе падарожжа было гульнёй, яна спужалася цяпер, калі вярнулася дадому і ёй расказалі, як



Ксенія Жукава з настаўніцай Ірынай Балкай.

перажывала мама, як яе шукалі», — згаджаецца са шматдзетнай маці Галіна Пасюк, дырэктар Кобрынскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

Галіна Вавілаўна ведае гэтую сям'ю і бывае тут на працягу апошніх гадоў шасці. Педагог кажа, што Галіна Жукава любіць сваіх дзяцей. Прадукты ў доме ёсць заўсёды. «Неяк прыязджаю, у яе пральная машынка зламалася. Дык яна ўжо з цэнтнер бялізны намыла рукамі». Перад школай на мільён рублёў купляе канцылярскіх тавараў.

І начальнік аддзела адукацыі Галіна Радковіч не раз бывала ў сям'і Жукавых. Паводле яе слоў, заўсёды прыязджалі сюды з намерам дапамагчы, падказаць. Рыхтавалі дакументы на адрасную дапамогу, якую Галіна атрымлівала летась, і цяпер пасля завяршэння фармальнасцяў атрымае. На недапушчальнасць знаходжання дзяцей без нагляду ўказала пракуратура пасля таго, як прапала Ксенія. Галіне прапанавалі двух малодшых школьнікаў — Віцю і Давіда — на вучэбную чвэрць аддаць у Маўчадскую санаторную школу-інтэрнат. І яны ўжо там, дарэчы. Дашкольнікаў меркавалася адправіць часова ў прытулак.

Але меншы сын Сярожа зламаў руку. Маці далі бальнічны па доглядзе, дзеці пакуль засталіся дома.

Увесь час, пакуль мы сядзелі і размаўлялі з Галінай, трохгадовы Сярожка з хворай ручкай, падвязанай хусцінкай, фактычна не злазіў з маміных рук. Ён, як той каток, лашчыўся да маці, нават неахвотна згадзіўся, каб яго пакарміла старэйшая сястра. А крышку пад'еўшы, зноў забраўся да мамы на калені.

— Вядома, ім з маці будзе лепш, — згадзілася Галіна Пасюк. Пакуль што малых не будзем забіраць з сям'і. Летам дапаможам з пуцёўкамі ў лагер.

Яшчэ кіраўнік сацыяльна-педагагічнага цэнтра прыехала ў Стрыгава з добрымі навінамі. Вядомасць гэтай сям'і ў краіне зрабіла сваю справу. Знайшоўся чалавек, які заявіў аб намеры аказаць сям'і матэрыяльную дапамогу. Пры ўмове, што маці ўладкуецца на працу бліжэй і будзе даглядаць дзяцей, ён гатовы выплачваць ёй па тры мільёны ў месяц на працягу года. Так гаворыцца ў лісце, што атрымалі ў аддзеле адукацыі. А з Кобрынскага мясакамбіната пазванілі і сказалі, што гатовы ўзяць шматдзетную маці на працу. Калі так усё выйдзе, гэта будзе самы лепшы варыянт для Галіны і яе дзяцей.

На развітанне Галіна Уладзіміраўна, 35-гадовая маці вялікай сям'і, сказала: «Я разумею, у такой сям'і, як мая, павінен быць бацька. Але дзе ж яго возьмеш, праз газету ж не «выпішаш»... Нам бы толькі крэдыты за дом, за карову выплаціць, а там лягчэй будзе. Агарод пасадзім. Галоўнае, каб усе дзеці былі са мной».

Хочацца верыць, што так і будзе. Што і для гэтай гаротнай вясковай жанчыны замаячыць нейкае святло ў акне. Нават маці Галіны, з якой здарыўся канфлікт з-за шматдзетнасці дачкі, калі даведалася аб прапажы ўнучкі, упершыню за шмат гадоў прыехала і прывезла бульбы і прадуктаў...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Кобрынскі раён.*

■ Вашы правы

# ІЛЬГОТЫ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

**Якая сям'я называецца шматдзетнай і на якую падтрымку дзяржавы яна можа разлічваць? Нас кансультуе намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.**

Статус шматдзетнай сям'і замацаваны ў арт. 62 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і. Згодна з законам, шматдзетнай з'яўляецца сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш дзяцей. Гэты статус сям'я набывае пры нараджэнні трэцяга дзіцяці і пры наяўнасці жывых дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Статус шматдзетнай сям'і пацвярджаецца пасведчаннем, якое выдаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Яно дае магчымасць скарыстацца ўсімі правамі, якія прадугледжаны законам. За атрыманнем пасведчання трэба звярнуцца ў службу «адно акно» ў мясцовы выканкам па месцы жыхарства (рэгістрацыі), прад'явіўшы пашпарты ці іншыя дакументы, якія сведчаць асобу, і наступныя дакументы:

— заява;

— пасведчанне аб заключэнні шлюбу (для тых, хто знаходзіцца ў шлюбе);

— копія рашэння суда (або пасведчання) аб скасаванні шлюбу (для тых, хто скасаваў шлюб);

— пасведчанні аб нараджэнні непаўналетніх дзяцей;

— даведка з месца жыхарства аб складзе сям'і (можа запрошвацца выканкамам).

## Крэдыты

Шматдзетным сем'ям даецца пазачарговае права на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў альбо на атрыманне аднаразовых субсідый. Максімальны тэрмін, на які прадастаўляюцца льготныя крэдыты для шматдзетных сем'яў, — 40 гадоў (1% гадавых).

Шматдзетныя сем'і, якія рэалізавалі сваё права на атрыманне льготнага крэдыту і (або) аднаразовай субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, а таксама сем'і, якія набылі статус шматдзетных пасля паляпшэння жыллёвых умоў з прыцягненнем ільготнага крэдыту і (або) аднаразовай субсідыі, маюць права на паўторнае атрыманне льготнага крэдыту або аднаразовай субсідыі, у тым ліку ў пазачарговым парадку, пры ўмове, што ўзніклі новыя падставы для пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу ў сувязі з нараджэннем, усынаўленнем, удачарэннем дзяцей.

Дзяржава дапамагае шматдзетным сем'ям пагашаць запазычанасць па льготных крэдытах пасля ўводу жылых дамоў у эксплуатацыю (набыцця жылых памяшканняў) у наступных памерах:

— пры наяўнасці траіх непаўналетніх дзяцей — 75% ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах;

— пры наяўнасці чатырох і больш непаўналетніх дзяцей — 100%.

## Жыллё

Права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання з дзяржаўнага жыллёвага фонду маюць шматдзетныя сем'і, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама маці, якім прысвоена званне «Маці-гераіня», або маці, якія ўзнагароджаны ордэнам Маці, ордэнам «Матчына слава» або «Медалём мацярынства». Пры гэтым агаворваюцца ўмовы: сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не павінен перавышаць бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва, вылічанага за 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу пастаноўкі на ўлік (і на дзень прадастаўлення жылога памяшкання), а кошт заяўленай маёмасці — не перавышаць памер кошту кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў.

## Сацыяльная дапамога

— Маці (бацьку, апекуну, папячыцелю), якая выхоўвае траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, прадастаўляецца адзін дадатковы свабодны ад працы дзень на тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку.

— У выпадку нараджэння ў сям'і адначасова траіх і больш дзяцей бясплатна прадастаўляюцца паслугі няні, пакуль малым не споўніцца 3 гады.

— Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога ў выглядзе прадуктаў харчавання для дзяцей першых двух гадоў жыцця даецца сем'ям, якія маюць сярэднедушавы даход ніжэйшы за крытэрый патрэбы. Сем'ям пры нараджэнні двайнят або большай колькасці дзяцей адначасова такая дапамога прадастаўляецца незалежна ад велічыні сярэднедушавога даходу. Акрамя таго, у залежнасці ад даходаў сям'я мае права на адрасную сацыяльную дапамогу, якая выплачваецца ў выглядзе аднаразовай і (альбо) штомесячнай сацыяльнай дапамогі.

— Плата за харчаванне дзяцей у садках зніжаецца напалову для сем'яў, якія маюць траіх і больш дзяцей да 18 гадоў.

— Навучэнцам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама ўстаноў вышэйшай адукацыі пры засваенні адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі належыць бясплатнае харчаванне, калі ў сям'і трое і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

— Плата за атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў школах мастацтваў не спаганяецца з сем'яў, якія маюць трох і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

— Для сем'яў, у якіх выхоўваецца трое і больш дзяцей дашкольнага ўзросту і/або дзяцей, якія навучаюцца ў агульнаадукацыйных установах, і/або спецыяльных установах адукацыі, і/або на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў вышэйшых навучальных установах, плата за карыстанне падручнікамі (навучальнымі дапаможнікамі) зніжаецца на 50%.

— Да навучальнага года шматдзетныя сем'і, дзе трое дзяцей навучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрымліваюць аднаразовую дапамогу — да 30% бюджэту пражытковага мінімуму на кожнага навучэнца (сёння памер БПМ складае 1 млн 128 тыс. рублёў).

— Кіраўнікі ВНУ, ССНУ, ПТВ і каледжаў маюць права прадастаўляць зніжкі з кошту навучання ў парадку і памерах, якія вызначаюцца ўрадам, выхадцам з сем'яў, дзе трое і больш непаўналетніх.

***

*Разам з рэспубліканскімі льготамі ёсць прэферэнцыі і рэгіянальныя. Напрыклад, у Мінску прадугледжана* ***дадатковая штомесячная сацыяльная дапамога*** *(1 базавая велічыня на кожнае дзіця) сем'ям, у якіх нарадзілася трайня ці больш дзяцей, пакуль ім не споўніцца 3 гады. Таксама да навучальнага года шматдзетныя сем'і, дзе хаця б адно дзіця навучаецца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрымліваюць аднаразовую дапамогу — да 30% БПМ на кожнага навучэнца.*

**Святлана БУСЬКО**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Акно ў Еўропу

# АТРЫМАЦЬ АНГЛІЙСКУЮ АДУКАЦЫЮ

## змогуць і беларускія старшакласнікі

**Падпісанне мемарандуму аб узаемапаразуменні паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і Асацыяцыяй бізнес-лідараў (АВЕ) Вялікабрытаніі стала адным з галоўных вынікаў I Міжнароднага адукацыйнага форуму «Еўрапейская якасць адукацыі» (EQE-Forum), які прайшоў у Мінску.**

Па словах міністра адукацыі Сяргея Маскевіча, гэта першы ў гісторыі Міністэрства адукацыі вопыт падпісання мемарандуму з прыватнай структурай, які для беларускага боку вельмі цікавы. Трэба патлумачыць, што Асацыяцыя бізнес-лідараў займаецца акрэдытацыяй ВНУ для навучання па праграмах АВЕ і дзейнічае ў 83 краінах свету.

АВЕ прапануе вучэбныя праграмы ў такіх сферах, як кіраванне бізнесам, інфармацыйнымі сістэмамі, кіраванне фінансамі, персаналам, турызм і гасцінічны бізнес і іншых. Усе яны акрэдытаваны Камітэтам па прызнанні якасці кваліфікацый і праграм пры Міністэрстве адукацыі Вялікабрытаніі, а таксама аналагічнымі органамі ў іншых краінах свету. Таму дыстанцыйнае навучанне па прафесійных кваліфікацыях АВЕ адкрывае для грамадзян самых розных краін магчымасць атрымаць англійскі дыплом, не пакідаючы сваёй краіны.

— Вялікабрытанія з'яўляецца сёння сусветным лідарам у прадастаўленні якаснай вышэйшай адукацыі, таму, упэўнены, для беларускіх ВНУ вельмі важна наладзіць супрацоўніцтва са сваімі калегамі з Вялікабрытаніі, — падкрэслівае Сяргей Маскевіч. — Таксама беларускія ВНУ змогуць больш актыўна развіваць і экспарт адукацыйных паслуг, даючы замежным грамадзянам магчымасць атрымаць адначасова з беларускім дыпломам і англійскі.

У Беларусі правайдарам праграм АВЕ выступае бізнес-школа «Магна Карта Оксфард» — адзін з арганізатараў форуму. Першы прарэктар бізнес-школы Вадзім Цітоў упэўнены, што зроблены сур'ёзны крок для папулярызацыі беларускай адукацыі ў свеце:

— У многіх краінах свету канстатуюць высокую якасць фундаментальнай вышэйшай адукацыі, якую даюць беларускія ВНУ. Цяпер замежныя студэнты, якія прыедуць навучацца ў Беларусь, змогуць адначасова атрымліваць і англійскую адукацыю. А гэта істотная перавага пры выбары маладымі людзьмі месца для навучання. Да таго ж дыпломы АВЕ прызнаюцца наймальнікамі ў 83 краінах свету, таму мы «адчыняем дзверы» і для беларусаў, і для замежных студэнтаў беларускіх ВНУ не толькі ў Еўропу, а ў свет. Для іх адкрываюцца новыя цікавыя магчымасці па атрыманні прафесійнай вышэйшай, прафесійнай паслядыпломнай адукацыі, а ў перспектыве — і прафесійнай доктарскай адукацыі.

Праграмы АВЕ прапануюць навучанне на розных узроўнях складанасці: ад 4-га (падрыхтоўка да паступлення) да 7-га ўзроўню (магістратура). Унікальнасць заключаецца яшчэ і ў тым, што праграмы АВЕ даступныя для вучняў старэйшых класаў беларускіх школ. А гэта азначае для іх істотную эканомію часу. Ад старту вучобы і да атрымання ступені бакалаўра можна сэканоміць цэлы год. А калі малады чалавек пажадае атрымаць ступень доктара, то ён сэканоміць 2,5 года свайго жыцця. Увогуле, кожны зможа пракласці сваю індывідуальную траекторыю навучання.

Згодна з мемарандумам, плануецца распрацаваць дакументы, якія дазваляюць устанавіць эквівалентнасць дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, выдадзеных у Беларусі, дыпломам АВЕ (узровень 6), а таксама дыпломаў магістра, выдадзеных у Беларусі, дыпломам АВЕ (узровень 7).

У сферы бізнес-адукацыі Беларусь і Вялікабрытанія знайшлі агульныя інтарэсы. «А ці знойдуцца такія ж агульныя пункты сутыкнення ў вобласці інжынерна-тэхнічнай адукацыі», — пацікавіліся мы ў пасла Вялікабрытаніі ў Беларусі Бруса Бакнэла.

— Я адназначна вітаю больш шчыльнае ўзаемадзеянне нашых краін у адукацыйнай сферы, — запэўніў Брус Бакнэл. — Гэта наш першы вопыт у арганізацыі і правядзенні такога мерапрыемства. Мяркую, калі будзе цікавасць, то наступным разам сюды прыедуць спецыялісты і эксперты ў галіне інжынернай адукацыі. Я гатовы стымуляваць такія кантакты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Наша спадчына

# СТРАЧАНАЕ І ЗНОЙДЗЕНАЕ

## Дзякуючы праекту Уладзіміра Ліхадзедава аднаўляюцца помнікі, выдаюцца кнігі і вяртаецца гістарычная памяць

**На працягу многіх гадоў газета «СБ. Беларусь сегодня» вяла рубрыку з публікацыямі старых паштовак — «У пошуках страчанага». Матэрыяламі яе з'яўляліся паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Газета зрабіла немайверна многа для выкарыстання філакартыі як крыніцы гістарычнай памяці. Працягваецца гэта работа і зараз. А днямі Уладзіміра Ліхадзедава ўзнагародзілі імператарскім ордэнам Святой Ганны. Высокую ўзнагароду вядомы беларускі калекцыянер атрымаў падчас святкавання дзесяцігоддзя аўтарскага праекта «У пошуках страчанага» з рук члена Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі Станіслава Думіна. Лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусі «За духоўнае адраджэнне» ў Нацыянальную бібліятэку прыйшлі павіншаваць высокія чыноўнікі, грамадскія дзеячы, навукоўцы, журналісты і сябры.**



— Дзякуючы праекту Уладзіміра Ліхадзедава мы адкрываем новыя старонкі нашай краіны, якія часам дазваляюць на многія рэчы паглядзець зусім па-іншаму, — зазначыў **Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму Максім РЫЖАНКОЎ.** — Будучы карэнным мінчанінам, на працягу многіх гадоў я гляджу, як мяняецца Мінск. Уладзімір зазірнуў яшчэ далей: ён параўноўвае горад праз дзесяцігоддзі. Радуе тое, што ўсё гэта можа ўбачыць амаль кожны: філакартыст не хавае сваіх калекцый, а паказвае і дорыць іх людзям.

Так, праект «У пошуках страчанага» стартаваў дзесяць гадоў таму на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня». Цыкл артыкулаў пра старадаўнія фотаздымкі і паштоўкі — а гэта больш чым 500 публікацый — даўно перарос газетныя межы. За гэты час праведзена больш за 50 выстаў, у тым ліку і за межамі нашай краіны. На аснове ўнікальнай калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава выпушчана 14 кніг. Дзякуючы праекту адноўлены помнік палеглым у вайне 1812 года пад Вілейкай і помнік праваслаўнаму псаломшчыку Фёдару Юзэфовічу ў Вялікай Гаці. Усё для таго, каб зберагчы мінулае Беларусі, каб захаваць унікальную гісторыю для будучых пакаленняў. Адсюль — і высокая адзнака кіраўніка дзяржавы.

Шматлікія ініцыятывы Уладзіміра Ліхадзедава падтрымліваюцца і ў Міністэрстве інфармацыі. Адзін з апошніх яскравых прыкладаў — экспазіцыя яго калекцый, а таксама артэфактаў часоў Першай сусветнай вайны, падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.



— Выстава «У пошуках страчанага», якая дэманстравалася на кніжным кірмашы, адлюстроўвае сённяшні дзень Беларусі, — падкрэсліла **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ.** — Дзякуючы палітыцы Прэзідэнта і ўрада, наша гісторыя — вялікі складнік менавіта сённяшняга дня. На гісторыі выхоўваюцца новыя пакаленні беларусаў. А гісторыя сведчыць пра тое, што Беларусь заўсёды была мужнай, а людзі — талерантнымі. Мы і сёння будуем свой беларускі дом упэўнена, прыгожа, у міры, ладзе і згодзе з усімі суседзямі, якія жывуць побач з намі. Беларусь — у такіх праектах, у такіх людзях, якія любяць сваю краіну, захоўваюць гісторыю і думаюць аб будучыні, высока несучы наша цяперашняе.

Калі рыхтавалася першая публікацыя ў рубрыцы «У пошуках страчанага», у Ліхадзедава спыталі: «Наколькі хопіць калекцыі?» А ён, доўга не думаючы, адказаў: «Гадоў на 10 дакладна». Дзесяцігоддзе прайшло імгненна. Наперадзе яшчэ шмат планаў і нерэалізаваных ідэй.

— Праца не спыняецца ні на хвіліну, — прызнаецца Уладзімір Ліхадзедаў. — Зараз шмат ідэй па ўвекавечванні падзей Першай сусветнай вайны. Убачыць свет серыя кніг, пад Вілейкай будзе створана алея памяці трох войнаў: 1812 года, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай. Зараз працуем і над планам узвядзення музея кнігадрукавання. Падобны музей адкрылі ў Польшчы мае калегі. Для нашага музея ўжо ёсць частка экспазіцыі. І да Дня пісьменства будзе сапраўдным сюрпрызам стварыць некалькі кніг па старадаўняй тэхналогіі, чаго яшчэ ніхто не зрабіў у свеце!

Якім чынам гэта будзе адбывацца, госці сустрэчы ўбачылі на свае вочы. На ўнікальным друкарскім абсталяванні канца XIX стагоддзя кніжныя старонкі і гравюры ў стылі эпохі Францыска Скарыны друкаваў Барыс Цітовіч, аднадумца і сябар калекцыянера. Уладзімір Ліхадзедаў, у сваю чаргу, падрыхтаваў экспазіцыі «Імгненні Першай сусветнай вайны. Погляд па абодва бакі фронту» і «Мінск. Падарожжа ў часе: да 70-годдзя вызвалення Беларусі», заснаваныя на сваіх фотаматэрыялах. Каля 200 арыгінальных паштовак першай паловы XX стагоддзя працягнуць экспанавацца ў Нацыянальнай бібліятэцы да 30 кастрычніка гэтага года. Акунуцца ў падзеі 100-гадовай даўніны і пабачыць Мінск такім, якім дагэтуль яго не ведалі, з'явіцца магчымасць і ва ўсіх ахвотных. Між іншым, многія калекцыі Ліхадзедава ўбачаць і балельшчыкі, якія прыедуць у Мінск на чэмпіянат свету па хакеі.

**Вераніка КАНЮТА**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Спорт

# ДРУГІ ЗАПЛЫЎ «ЗАЛАТОЙ РЫБКІ»

**Агульнанацыянальны фестываль плавання распачаўся ў Беларусі ў сакавіку. На дарожкі басейнаў выходзяць дзеці, якім ужо споўнілася 9 і 10 гадоў. Але цяпер у конкурсе могуць удзельнічаць і юныя спартсмены, што прафесійна займаюцца плаваннем.**

### Басейны па-ранейшаму ў дэфіцыце

— Унікальныя для нашай краіны спаборніцтвы прыжыліся ў нас, спадабаліся беларусам, — гаворыць **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Валянціна БАЛЯБА.** — Калі ў першым конкурсе ўдзельнічала толькі траціна беларускіх школ, то сёлета іх колькасць павялічылася амаль удвая. Але вучні прыкладна тысячы школ, на жаль, паспаборнічаць у плаванні не могуць дагэтуль. І прычына найчасцей — істотны недахоп басейнаў... Матэматыка тут вельмі простая. У краіне сёння працуюць 963 басейны, але ва ўстановах сістэмы адукацыі з іх толькі 61 стандартны і 35 мініяцюрных... Зразумела, што тысячы вучняў застаюцца пазбаўленымі водных спаборніцтваў не па сваёй віне. Мы хочам падключыць да гэтай справы як мага больш арганізацый, на балансе якіх знаходзяцца басейны. Бо плаванню мусяць навучыцца ў школьныя гады ўсе дзеці. У пэўны момант гэты каштоўны навык можа выратаваць жыццё. Уменне плаваць — неблагі зачын і для аздараўлення падлеткаў, і для фарміравання спартыўнага рэзерву. А трэнеры своечасова звернуць увагу на таленавітых дзяцей, з якіх пасля, мабыць, выйдзе не адзін будучы чэмпіён свету...

### «Не хочацца мерапрыемстваў для «птушачкі»...

Сёлета у першым этапе «Залатой рыбкі» стартавалі 17 тысяч чалавек. Абласны і рэспубліканскі этапы конкурсу пройдуць у красавіку і маі. Фінал спаборніцтваў адбудзецца 24 мая на базе Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Выбар на ім спыніўся таму, што тут калісьці вучылася зорная айчынная плыўчыха **Аляксандра Герасіменя,** якая і стала адной з заснавальнікаў спаборніцтваў.

— Чаго мне вельмі не хочацца, дык гэта каб конкурс праходзіў для «птушачкі», — гаворыць Аляксандра. — Даводзілася сутыкацца з тым, што сем'і, якія ўдзельнічаюць у эстафеце, былі скампанаваны наступным чынам: мама з адной сям'і, тата — з другой, а дзіця было ўвогуле з трэцяй. Ёсць раёны, дзе конкурс арганізуецца на найвышэйшым узроўні, і ў той жа час у іншым месцы ўсё робяць выключна для справаздачы. Але такі фармалісцкі падыход папросту дыскрэдытуе самы галоўны спартыўны прынцып — добрасумленнасць... Акрамя таго, у пачатку красавіка шосты дзень нараджэння адзначыў спартыўна-дабрачынны праект «Мары здзяйсняюцца», які аб'ядноўвае зорак беларускага спорту. Мэта яго простая — дапамагчы хворым дзецям і людзям з абмежаванымі магчымасцямі, паказаць пры гэтым, што тых, каму патрэбна дапамога, не варта адрозніваць па нацыянальных, рэлігійных ці іншых прыкметах. За гэты час спартсмены правялі сотні дабрачынных акцый у 130 гарадах і вёсках Беларусі. Сёлета геаграфічныя межы праекта пашырыліся. У ім сталі ўдзельнічаць спартсмены, якія выступаюць і жывуць «за кардонам». У спісе краін — Арменія, Германія, Венгрыя, Літва, Расія, Польшча, ЗША, Францыя, Турцыя, Украіна...

### «Вельмі хочацца, каб нашых людзей палюбілі»

Аляксандра Герасіменя вядомая і сваёй актыўнай грамадскай пазіцыяй. Адказваючы на пытанні журналістаў, спартсменка закранула і пытанне беларускай ідэнтычнасці.

— Мне вельмі падабаецца мая родная краіна. І без чаго нельга ўявіць сабе станаўленне народа — гэта без адчування сябе беларусам. І мне вельмі хочацца, каб нашых людзей палюбілі за іх якасці ў краінах Заходняй Еўропы. Узгадаем нядаўнюю гісторыю. У савецкі час беларусы былі ў пашане за сваю шчырасць, адкрытасць, дабрыню. Пералічваць гэтыя адметныя рысы можна доўга...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Размовы на кухні

# НА ШТО ЗДОЛЬНЫ ЧАЛАВЕК У ДОМЕ?

## Вочы баяцца, а рукі...

**А што рукі? Яны патрэбны заўсёды і кожнаму. І ва ўсіх сэнсах. Няхай гавораць пра канфлікт «лірыкаў і фізікаў», усё роўна кожны мужчына рана ці позна сутыкаецца з тым, што ў доме нешта трэба зрабіць — ці цвік забіць, ці кран памяняць. Гэта адбываецца тады, калі мужчына становіцца чалавекам (так у Беларусі ў некаторых рэгіёнах называюць мужа. — Аўт.). Таты больш няма побач, пачынаецца самастойнае жыццё галавы новай сям'і. Вось мы і вырашылі падлічыць, колькі каштуюць добрыя рукі...**



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

### Што лепш — прафесійны «найміт» ці самадзейнасць?

**У. К.** — За свой нядоўгі век у два тузіны гадкоў я перажыў тры пераезды і два з паловаю рамонты. Надыхаўся фарбай ды шпалерным клеем і запэцкаўся пылам на ўсё жыццё... Адзін раз я дапамагаў бацькам, калі рамонт амаль увесь мы рабілі саматужна. Другі ад мяне патрабаваў толькі прыборкі пасля рабочых. А палавінай я называю невялікі касметычны рамонт і змену мэблі, дзе мой удзел быў самым непасрэдным. І цяпер магу сказаць — лепей заплаціць спецыялістам, якія ўсё зробяць за цябе...

**С. К.** — Я так разумею, што ты вырашыў быць «ідэальным гуманітарыем», які будзе зарабляць галавой столькі грошай, каб іх хапіла на гэтых самых прафесійных «наймітаў»? Погляд сучасны, згодзен. Але гэта неяк не па-нашаму. У новай кватэры мая сям'я жыве ўжо 7 гадоў, аднак за гэты час спецыяліста выклікалі толькі аднойчы — для рамонту тэлевізара па гарантыі.

**У. К.** — Здаецца, і вы некалі тэлевізары збіралі, ці не так? Але потым «закапалі» гэты свой талент і падаліся ў «лірыкі». З чаго б гэта? Значыць, і вам не асабліва хочацца затлумляць галаву і напружвацца, каб тое-сёе ў доме зрабіць.

**С. К.** — Не маеш рацыі. «Тэлікі» я і сапраўды больш не збіраю, але рукі ў мяне пакуль з правільнага месца растуць. Наколькі я ведаю, калега, ты панічна баішся стасункаў з сантэхнікай. Ды і з электрычнасцю ў цябе «нацягнутыя ўзаемаадносіны», а дакладней, іх амаль зусім няма. Спадзяюся, ты ў курсе, што ў разетцы 220 вольт жыве? Ну, не крыўдуй. Давай лепш разбярэмся, што кожны сапраўдны мужчына можа зрабіць самастойна, а потым і падлічым, колькі ўласная «рукастасць» каштуе.

### Калі ў кране няма вады...

**У. К.** — Вы, мабыць, на пракладкі ў кране намякаеце? Ну не ведаю я, як іх мяняць. Што з таго? Усё роўна амаль у кожным доме замест старых кранаў ставяць імпартныя, у якіх і пракладак тых няма. Калі ў каго такія савецкія краны засталіся, то патэлефанаваў у ЖЭС — і за 27 тысяч табе ўсё зробяць. Ну што, з'елі?

**С. К.** — Гэта калі толькі пракладку памяняць, то атрымліваюцца капейкі. Але наш чалавек сантэхніка выклікае ў тым выпадку, калі ў ванным пакоі ці на кухні сапраўдная аварыйная сітуацыя здараецца. Вам тады для правядзення абследавання ўжо спецыяліста выклікаць трэба, кансультацыя якога абыдзецца мінімум у 20 тысяч рублёў. А цяпер уяві, што перад вячэрай кран пацёк — што, будзеш увесь «стаяк» перакрываць і чакаць таго самага сантэхніка? А спецыяліст, можа, толькі на наступны дзень прыйдзе. І яшчэ не факт, што ў зручны для цябе час. І посуд не памыеш, і сам «свіннёй» застанешся. А сапраўдны мужык такую пракладку за пяць хвілін памяняе — тут табе і эканомія, і павага жонкі.

**У. К.** — Неяк вы танна павагу жонкі купляеце. Пракладачку памянялі — і ўсё, герой. Аднак што вы будзеце рабіць, калі спатрэбіцца памяняць увесь змяшальнік? А яшчэ большым подзвігам можа стаць устаноўка пральнай машыны, без якой сёння ніводная сям'я ўжо не абыдзецца...

**С. К.** — Здзіўляюся я табе: тры пераезды перажыў — і такое... Ды змяшальнік мяняецца на раз-два. Тут галоўнае, каб адпаведныя інструменты былі. І, зразумела, інструкцыю трэба ўважліва пачытаць. З пральнай машынай таксама ніякіх праблем не павінна быць у дарослага чалавека. Але ў гэтым выпадку інструкцыю такой складанай для цябе тэхнікі трэба будзе разы тры прачытаць і параіцца з сябрамі. Толькі не забудзься, «чайнік», спачатку дастаць фіксатары для барабана. А пасля падключэння да вады і каналізацыі машыну трэба абавязкова зазямліць, каб корпус «круцёлкі» цябе токам не дзеўбануў. Менавіта за такія веды спецыялісты мясцовага ЖЭСа і бяруць грошы — ад 100 да 150 тысяч за змяшальнік і 250 — за «пралку».

**У. К.** — І вы дзеля эканоміі 300-400 тысяч два дні вывучалі інструкцыю, тры дні думалі, а потым суткі працавалі? Сумнеўная гаспадарлівасць. Тым больш, наўрад ці вы можаце назваць сябе «майстрам на ўсе рукі» — няўжо ванну таксама самі ўстановіце ці кафлю пакладзяце?

**С. К.** — Тут згаджуся з табою толькі часткова. Пральную машыну я ўстанаўліваў ажно чатыры гадзіны. Затое цяпер я ўсё пра яе ведаю: як абслугоўваць, якая прафілактыка патрэбна, усе рэжымы працы. А вось ванну не ставіў, ды і жадання няма. На мой погляд, гэта якраз адна з тых аперацый, дзе прафесіяналы патрэбны. Спачатку ж трэба старую зняць і пры гэтым нічога там не зламаць. Тут мінімум два майстры павінны папацець. Уся гэта «ракіроўка» будзе каштаваць каля 420 тысяч рублёў. А з кафляй увогуле справа далікатная.

### З электрычнасцю на «ты»

**У. К.** — Вось бачыце. А яшчэ з мяне смеяцеся. Не хвалюйцеся, Сяргей Андрэевіч, нешта нязначнае ў побыце і я магу зрабіць, калі спатрэбіцца. Скажам, памяняць лямпачку для мяне не праблема. Для такой аперацыі я не буду выклікаць спецыяліста, які за кожную лямпачку возьме ад 1 да 4 тысяч.

**С. К.** — І люстру таксама павесіш? Дакладна ведаю, што не. Змена звычайнай свяцільні з лямпачкамі больш за 86 тысяч рублёў каштуе, а з «галагенкамі» — увогуле на 170 тысяч пацягне. А выключальнік ці разетку ты паправіш? Па вачах бачу, што не. А гэта яшчэ 48 тысяч. Калі гэта блок «выключальнік—пераключальнік—разетка», то ўвогуле 108 тысяч набягае. Капейка да капейкі — а ў выніку рубель. Мы ж у школе ўсе фізіку вывучалі, таму з элементарнымі «прыборамі» павінны самі разбірацца.

**У. К.** — У школе я добра вучыўся. І тэарэтычна выдатна ведаю, як дзейнічаюць электрапрыборы, адкуль бярэцца электрычнасць і да таго падобнае. А вось на практыцы... Карацей, вопыту ў мяне малавата. Былі часы, калі я не ведаў, што «выбіванне пробак» лёгка рамантуецца адным шчаўчком па тумблеры.

**С. К.** — Не трэба ў XXI стагоддзі баяцца электрычнасці. З ёю неабходна сябраваць. А інакш атрымаецца, як у майго знаёмага, які выклікаў электрыка для замены батарэек у пажарным апавяшчальніку. Напрыклад, я нават разводку тэлевізійнага кабеля зрабіў у кожны пакой. Гэта мне сэканоміла мінімум 70-80 баксаў. Для гэтага вышэйшая тэхнічная адукацыя зусім не патрабуецца.

### LEGO для дарослых

**У. К.** — Я і са сваёй адукацыяй сябе нядрэнна адчуваю. Вунь нядаўна сэканоміў маці паўмільёна на тым, што сам сабраў новую секцыю. У магазіне прапаноўвалі зборку за 10% ад кошту мэблі. Мы адмовіліся і вырашылі паспрабаваць самі. Нічога — добра атрымалася. Праўда, мне спатрэбіўся тыдзень. Затое як гэта было цікава! І цяпер мяне ніякая шафа ці камод не спужаюць. Тым больш што вымяраць звычайна нічога не трэба — вытворца пазначае асноўныя «дзірачкі» і «пазікі». Не праца — адно задавальненне!

**С. К.** — Рукамі не махай. Во разышоўся! Адразу відаць, што ў дзяцінстве добрага канструктара не было. Можа, ты цяпер рызыкнеш самастойна сабраць і дарагую сучасную кухню? Зробленую пад заказ кухню я і пальцам не крану — няхай прафесіяналы і ўстанаўліваюць. Тут я купляю не «канструктар», а гатовую рэч. А магазінную «штампоўку» самі не збіраюць толькі гультаі. І адзінокія жанчыны.

Дарэчы, у касметычным рамонце існуе адна бадай самая нервовая аперацыя — паклейка шпалер. Калі робіш яе ўпершыню, то адразу даведаешся ад жонкі пра ўсе свае недахопы і перавагі. Калі сям'я тры разы сумесна паклеіла шпалеры (і ўсе пры гэтым засталіся жывымі), на маю думку, яна ўжо не распадзецца ніколі. У выпадку запрашэння жэсаўскіх спецыялістаў у сямейным бюджэце адкрыецца «чорная дзірка» — аклейванне «сур'ёзнымі» шпалерамі каштуе ад 26 да 50 тысяч рублёў за квадратны метр сцяны. Сярэдні пакойчык пацягне метраў на сорак, адпаведна — ад 1 да 2 мільёнаў.

**У. К.** — Маеце рацыю. А я ведаю, на чым яшчэ можна рэальна «падняцца». У дзядулевай кватэры слалі днямі лінолеум. Спачатку думалі, што без дапамогі «чужынцаў» нічога не атрымаецца. Шкада нам стала аддаваць ад 2 да 7 долараў за квадратны метр. А плошча ўсё ж такі вялікая — метраў 25 агулам. 50-170 «баксаў» — таксама грошы. Карацей, сам я ўсё выразаў і паклаў, хаця і давялося папоўзаць на карачках. Не такі страшны чорт, як яго малююць. І яшчэ невядома, ці лепей бы яны зрабілі, — не асабліва я давяраю спецыялістам з ЖЭСа.

### У прыватнікаў і сантэхнік з «бабачкай»

**С. К.** — У цябе, мабыць, адмоўнае стаўленне да «мясцовых спяцоў» засталося яшчэ з тых часоў, калі п'яны сантэхнік за бутэльку пракладкі мяняў. Хадзіў ён па кватэры ў брудных ботах... Цяпер жа ёсць розныя спецыяльныя канторы кшталту «муж на гадзіну». Там да цябе адправяць ветлівага, чыста апранутага майстра... Аднак расцэнкі будуць зусім іншыя. Вось паглядзі. Кансультацыя — каля 50-60 тысяч. За першую гадзіну працы — ледзь не 300 тысяч рублёў у сталіцы. За другую — каля 170. На парадак танней будзе ў рэгіёнах. І гэта толькі за працу па дробязях — разетку паправіць, замок урэзаць і іншае. За больш складаныя работы трэба будзе плаціць асобна і таксама нямала. Скажам, абкласці сцены кафляй каштуе ад 15 да 20 «зялёных» за квадратны метр. І гэта без уліку сабекошту матэрыялу.

**У. К.** — Але ж карыстаюцца попытам такія паслугі. Інакш бы іх не было. Некаторыя нават замаўляюць прыборку ў кватэры. І каштуе гэта нятанна — ад 2 да 4 долараў за квадратны метр. Ну, праўда, будзе зроблена вільготная прыборка кухні, ванны і прыбіральні, усіх пакояў ды нават мыццё вокнаў. Хаця мне здаецца, што гэта ўжо занадта — прыбрацца можна і самому, асабліва за такія грошы.

**С. К.** — У маёй вялікай сям'і дзеткі з пыласосам пачалі сябраваць гадоў з дзесяці. Вільготнай уборкай не грэбуюць і вокны знутры да бляску даводзяць. А грошы я ім даю выключна за добрыя адзнакі — па выніках чвэрці. Усе задаволены — і я не збяднею.

**У. К.** — Добра вам. А ўвогуле, пакуль мы з вамі размаўлялі, узнікла адна ідэя — што калі стварылі б добрыя людзі (гаспадарлівыя, як вы) нейкія курсы для тых, хто чагосьці не ўмее рабіць. Думаю, шмат хто скарыстаўся б.

**С. К.** — Перад тым, як ісці на такія курсы, прыміце ад мяне бясплатную параду: у кожнага мужчыны ў доме павінна быць «аварыйная валізка». Пакладзіце туды некалькі адвёртак, малаток, пасатыжы, кусачкі, дрыль, пілу, клей, розныя цвікі і шурубы. А ў ідэале яшчэ паяльнік і тэстар для электрычнасці. Тады, можа быць, «напрамак росту рук» будзе скарэктаваны.

**Сяргей КУРКАЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Факт

## 25 ПІКАЎ «ТЭЛЕВЯРШЫНІ»

**На наступным тыдні ў Мінску зноў прагучыць неафіцыйны гімн тэлевізіёншчыкаў — усіх тых, хто робіць штодзённыя выпускі тэлевізійных навін і піша сцэнарыі маштабных праектаў, стварае прамыя эфіры і запісы праграм, працуе на камеру ці за ёю, забаўляе і запрашае да дыскусіі... Адбудзецца гэта на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня», які праходзіць сёлета ўжо ў дзясяты раз.**

Прафесійнае журы, у склад якога ўваходзяць вядомыя рэжысёры, сцэнарысты, акцёры, журналісты, з усіх дасланых на конкурс заявак праграм, якія выйшлі ў эфір на працягу 2013 года, вызначыла па 3 фіналісты ў кожнай намінацыі. Усяго ж іх сёлета 25, уключаючы галоўную — «Гран-пры «Тэлевізійны праект года». Новая ў спісе — «Лепшая тэматычная праграма рэгіянальнага тэлебачання», а вось намінацыі «Дэбют года», магчымасць увядзення якой аргкамітэт абмяркоўваў летась, пакуль што няма.

Да юбілейнай цырымоніі тэлеканал АНТ (арганізацыю і трансляцыю мерапрыемства па чарзе бярэ на сябе адзін з рэспубліканскіх тэлеканалаў — «Беларусь1», АНТ і СТБ) рыхтуе шэраг сюрпрызаў. Праўда, усе яны пакуль што трымаюцца ў сакрэце, аднак арганізатары запэўніваюць: усё будзе на вышэйшым узроўні.

Праверыць гэта гледачы змогуць неўзабаве: тэлеверсія цырымоніі выйдзе ў эфір АНТ 19 красавіка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## УСЕ НА АРЭЛІ!

**Сталічныя паркі атракцыёнаў адкрылі новы сезон.**

Што датычыцць рэжыму работы атракцыёнаў, то, як інфармуе ўнітарнае прадпрыемства «Гарадскія паркі Мінсказелянбуда», наведаць іх у парках імя М. Горкага, Чалюскінцаў і 900-годдзя горада Мінска па панядзелках можна з 15.00 да 21.00. З аўторка па чацвер на атракцыёны ёсць магчымасць прыйсці з 11.00 да 21.00. У нядзелю, а таксама ў святочныя і перадсвяточныя дні паркі чакаюць гасцей з 11.00 да 22.00. Яшчэ адно месца адпачынку — парк 50-годдзя Вялікага Кастрычніка — запрашае на атракцыёны кожны дзень з 11.00 да 19.00, а ў парку імя Чалюскінцаў, акрамя забаў на арэлях і каруселях, гасцям прапануюць танцавальныя праграмы, якія будуць праходзіць па выхадных з 16.30 да 18.30.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

Карту международного моторного страхования (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY/07/9641588 и квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-су серии КС № 3605367 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

21.04.2014 г. УП «МГЦН» проводится аукцион по продаже офиса, 243 кв.м, г. Минск, ул. Сурганова, д.41, пом. 306. http://mgcn.by/auctions/sale/00000869.html Тел. (017)295-72-44, (VEL) 326-37-81 (Быстрицкий А.Ю.)

В **суд Ганцевичского района** поступило заявление об объявлении умершим СЕРГИЕНЯ Виталия Федоровича, 17 июля 1970 года рождения, уроженца д. Чудин Ганцевичского района Брестской области.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Сергиене Виталии Федоровиче, сообщить их суду Ганцевичского района по адресу: 225432 г. Ганцевичи, ул. Коммунистическая, 21, в течение двух месяцев со дня публикации объявления.

Утерянный страховой полис ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования наземных транспортных средств граждан формы 2РН серии БИ № 0011829 **считать недействительным.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

### извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Оптоэлектронные системы»

| Лот № 1 | Здание административно-хозяйственное с инв. № 500/С-10550 | г. Минск, ул. Черняховского, д. 1 | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 7 920 960 000 | 396 048 000 | 5 |

Назначение – здание административно-хозяйственное, литер А 2/К. Год постройки – 1956. Площадь застройки/общая – 655 м²/885,1 м². Этажей – 2. Фундамент – бутовый ленточный. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия чердачные, междуэтажные – деревянные. Крыша – шиферная, двухскатная. Полы – плитка, линолеум, дощатые. Проемы оконные – двойные деревянные. Проемы дверные – филенчатые. Наружная отделка цоколя – облицован силикатным кирпичом. Внутренняя отделка – окрашено, оштукатурено, облицовано плиткой, оклеено обоями. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка. Водопровод, горячее водоснабжение – стальные трубы. Канализация – чугунные трубы. Ванные (души) – душ. Вентиляция – вентканалы в стенах. Радио – ретрансляционная сеть. Телефон – каблирован. Составные части и принадлежности: пристройка (Ж1/к), пристройка (И1/к).
Дворовое покрытие – мелкозернистая асфальтобетонная смесь (186 м²); площадка – мелкозернистая асфальтобетонная смесь с бордюрным камнем, 2 шт. (66 м² и 9 м²); пешеходная дорожка – бетон (4 м²); бордюр 0,14 – цементно-песчаный раствор (22,55 м.п.).

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания административно-хозяйственного.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Часть здания с инв. №500/С-10550 сдается в аренду: 19,3 м² по 31.05.2014; 21,8 м² по 31.12.2015; 23,4 м² по 31.12.2015; 28,3 м² по 31.12.2015; 63 м² по 31.12.2015; 19 м² по 31.12.2015; 79,9 м² по 31.05.2014; 31,3 м² по 31.12.2015; 58 м² по 31.12.2016; 80,6 м² по 31.05.2014; 30,1 м² по 30.04.2014; 38,7 м² по 31.12.2015; 10,1 м² по 31.01.2016; 22 м² по 31.05.2016.
Земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284 сдается по договору аренды ОАО «Оптоэлектронные системы» на срок по 28.02.2015.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: в охранной зоне линий связи и радиофикации, площадь 0,0184 га; охранной зоне линий электропередачи, площадь 0,0055 га; охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,0040 га.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Оплата стоимости приобретенного на аукционе Объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 20 000 000 руб. на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 23.04.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос.регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оптоэлектронные системы», проводимом 23 апреля 2014 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 22.04.2014 в 12.00.

Заключительная регистрация участников 23.04.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Рогожник Александр Николаевич 8 (029) 127-38-89.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
